Тэма: Пазакласнае чытанне. Адам Русак. «Святло далёкай зоркі”.

Мэты:
-паглыбіць веды вучняў пра нашага земляка, паэта-пісьменніка Адама Русака;
-развіваць пазнаваўчую актыўнасць вучняў, вуснае маўленне, тэхніку выразнага чытання вершаваных твораў;
-выхоўваць любоў і гонар за нашу спадчыну.

Абсталяванне: прэзентацыя, выстава твораў пісьменніка, крыжаванка.

**Ход урока**

I. **Арганізацыйны момант**

II. **Слова настаўніка**

(*слайд 1*)

-Сёння мы з вамі адправімся ў падарожжа да далёкай зоркі, якая носіць імя нашага земляка, паэта-песенніка Адама Русака. Гэта вельмі яскравая і знакамітая зорка на нашым небасхіле, якая і сёння дорыць нам сваё святло. Чаму? Аб гэтым мы з вамі даведаемся падчас нашага падарожжа.

III. **Паведамленне тэмы, мэтаў урока**

(*слайд 2*).

-На уроку мы паглыбім свае веды пра Адама Русака, больш падрабязна спынімся на некаторых звестках з жыцця гэтага славутага чалавека, узгадаем яго творчасць.

**1. Звесткі з біяграфіі пісьменніка**.

- Адкажыце, што вам ужо вядома пра Адама Русака?

(*выказванні вучняў*).

-Паэт-песеннік, музыкант. Нарадзіўся ў вёсцы Пясочнае Капыльскага раёна. Яго імем названа вуліца ў Пясочным. Вучыўся ў Песачанскай школе. У школе ў музеі, а таксама ў доме культуры створаны куткі, прысвечаныя Адаму Русаку (*слайды 3,4*).

(*працяг настаўніка, слайд 5*)

-З маленства Адам Русак марыў атрымаць музычную адукацыю, стаць прафесіяналам-скрыпачом. У 1930 годзе яму ўдалося скончыць Мінскі музычны тэхнікум. Затым быў залічаны ў Ленінградскую кансерваторыю. Кожнае лета ён прыязджаў у родныя мясціны, сустракаўся з сябрамі ў Пясочным. Ужо ў той час пачаў пісаць вершы. Звыш 200 вершаў сталі песнямі. Вершы перакладзены на розныя мовы.

(звярнуцца да выставы яго зборнікаў)

-На нашай выставе прадстаўлены зборнікі вершаў, з якімі вы зможаце пазнаёміцца пасля ўроку.

**2. Праслухванне песні.**

-Як я ўжо сказала, шмат вершаў Адама Русака сталі песнямі. Зараз я вам прапаную паслухаць песню “Не шукай” у выкананні нашых педагогаў Скараход М.М. і Майсюка М.П.

**3. Конкурс чытачоў вершаў Адама Русака.**

-Некаторыя нашы вучні выявілі жаданне ўдзельнічаць у конкурсе чытачоў вершаў Адама Русака (2-3 вучні чытаюць на памяць вершы).

- Як вы бачыце, Адам Русак пісаў вершы на розныя тэмы. Спадабаліся вам вершы? Аб чым яны?

**4.Прагляд фрагмента з кінафільма** “Часы спыніліся апоўдні” (песня Марыны).

- Ёсць у Адама Русака вершы, якія нават выкарыстоўваюцца ў кінафільмах (прагляд фрагмента).

- Што Адам Русак выказаў гэтай песняй? (любоў да каханай, песні кранаюць сэрца, пранікнёныя).

**5. Чытанне верша настаўнікам**

- Давайце абагульнім веды пра нашага земляка, вядомага паэта-песенніка Адама Русака. Зараз я вам прапаную паслухаць верш Мікалая Пятровіча Майсюка, які раней працаваў у нашай школе настаўнікам матэматыкі.

Адам Русак…Славуты наш зямляк,
Тваіх радкоў смакуем мы нектар.
Ты-мовы роднай сапраўды мастак!
Вялікі дзякуй за вялікі дар…

У вёсцы, дзе бярэ пачатак бацька Нёман,
Нядаўна жыў паэт, яго любіў народ.
Ён шмат дзе пабываў, але заўсёды помніў
Капыльшчыну-радзіму, Малінаўкі цяпло.

Малінаўка зімой заўсёды сагравала,
Малінаўка вясной у квецені была,
Цябе яна ўлетку на пасецы чакала,
Увосень з бульбы дранікі пякла.

Ты назіраў буслоў, што зноў кружылі ў небе,
І пра каханне ты не мог не напісаць,
З дзядамі ты любіў пагаварыць аб хлебе,
Са сведкамі вайны вайну успамінаць.

Радзіму бачыў ты дзяўчынай маладою,
Матулі роднай рыфмай ажывіў.
У доўгі шлях жыцця ты ліру ўзяў з сабою,
Свой талент песняра для нас усіх раскрыў.

Ад сэрца вершы йшлі, як мёд ліліся песні
Да той пары, пакуль цякла ў жылах кроў…
У памяці людской заўжды ты застанешся…
Зямны паклон табе ад нас, тваіх сяброў!

-Давайце падагульнім, што мы даведаліся на ўроку пра творчасць А.Русака, выкарыстоўвайце думкі з гэтага верша.

**IV. Дамашняе заданне**

- Неабходна разгадаць крыжаванку, карыстаючыся зборнікамі вершаў Адама Русака, якія прадстаўлены на нашай выставе. Крыжаванку для вас падрыхтаваў таксама Мікалай Пятровіч Майсюк.
- Скажыце, хто з вас быў уважлівым і запомніў дату нараджэння Адама Русака? (24 мая). Дык вось, здаць крыжаванкі патрэбна 24 мая, у дзень нараджэння пісьменніка.

**V. Падвядзенне вынікаў урока**

- Вось і скончылася наша падарожжа. Спадабалася яно вам? Я спадзяюся, што падарожжа пакінула ў вашых сэрцах радасць і захапленне. І напрыканцы мне хочацца, каб мы з вамі сказалі нашым гасцям словамі Адама Русака: “Бывайце здаровы, жывіце багата…” (уваходіць Майсюк М.П. і разам з настаўнікам выконваюць песню “Бывайце здаровы…”).